Автор создает поэтическую территорию, которая включает яркий образ-архетип «Дома», воспроизводит особую духовную атмосферу своей родины, создает ее своеобразный литературный портрет. Поэтическая ткань стихов максимально насыщена символами, образно-метафорическими компонентами, архетипами, яркими образами родной природы, несущими в себе идею жизни («ты сустрэнь мяне, о поле, шыр-прасторамі»; «вецер вячэрні»; «ніва родная перада мною»; «дума-песня»; «адлёт жураўлёў»; «вольны покліч далёка нясецца ў паднябесных сініх шляхох»; «далёка здесь, родны астаўся парог – асталася вечнае сэрца»; «вецер вербы цалуе»). С другой стороны, воспроизводятся темные реалии истории («шэрыя панурыя хаты, што сонца спрадвеку ня бачылі, ім нядоля – сястрыца, і голад ім – брат»; «крыжамі мукі крывава пратораны сьлед»; «сэрцы нямыя – ўжо з іх нетраў ня выйдзе нявольніцкі ўздых; яны ў гордую ціш закаваліся»; «ногі босыя», «закарэлыя, цьвёрдыя рукі», «чорная доля, як чорны хлеб»; «гэтак ціха маўчаць умее толькі магутны боль»; «мутнае неба», «доля сабачая»; «віхры ўзьвіліся, цемру чорную раскалыхалі»; «месяц умурзаны, ён зоры топча – круглы, жоўты і горды»). Яркие образы вызывают сильные ассоциации, существующие в культурном сознании белорусских людей.

Писатель раскрывает особенности большого белорусского национального мира с помощью символизма, образно-ассоциативных возможностей поэзии, внутренней логики, тонко чувствуя особенности художественного слова и глубоко проникая во внутренний мир человека. Лирические переживания насыщаются драматизмом и трагизмом, а все созданные образы, архетипы и художественные детали психологизируются. Обращение к истории страны и ее воссоздание способствует выявлению культурной идентичности автора и раскрытию особенностей его национального самосознания. С большой художественной силой и яркими зримыми образами автор восстанавливает эпизоды белорусской истории и осуществляет реконструкцию забытого хронотопа Беларуси. В то же время, для творчества А. Берёзки характерно создание и универсальных образов (изображения войны, катастрофизм, ощущение внутреннего опустошения, трагизм бытия), что реализовывалось в обобщающих образах, направленных на осмысление истории всего человечества.

**М. С. Рагачэўская**

## ЯК ЧЫТАЦЬ ГУМАНІСТЫЧНЫ ПАДТЭКСТ У АПОШНІХ ТВОРАХ В. БЫКАВА?

Творчасць Васіля Быкава (1924–2003) для даследчыкаў не перастае быць актуальнай па цэлым шэрагу крытэрыяў. Па-першае, яго малая проза з’яўляецца сімвалам народнай памяці аб вайне – дакладнай, аб’ектыўнай і праўдзівай, без налёту прапаганды і ідэалогіі. Па-другое, манеру і стыль мастака слова вызначае тонкі псіхалагізм рэалістычнага кшталту, з уплывам

тэндэнцый інтэлектуалізацыі прозы напрыканцы XX ст. Па-трэцяе, філасофска-гуманістычны падтэкст, асабліва апошняга творчага перыяду, дае нацыянальнай літаратуры сваю ідэю, сваю самабытную постаць.

Апошнім перыядам творчай працы В. Быкава звычайна лічаць 1990-я – пачатак 2000-х гадоў. З аднаго боку, пісьменнік прадоўжыў эстэтычныя развагі пра вайну ў жанры апавядання і аповесці («На чорных лядах», «Бедныя людзі» (1994), «Жоўты пясочак», «Зенітчыца», «Палкаводзец», «Палітрук Каламіец», «Падоранае жыццё» (1995), «Пакахай мяне, салдацік» (1996), «Балота» (2001)). З другога боку, магутны інтэлект не мог абысці ўвагай і сучасныя яму падзеі, што адазваліся трагедыяй у лёсе народа (аповесць «Ваўчыная яма» (1999), пра жыццё ў Чарнобыльскай зоне).

Сярод апошніх твораў В. Быкава – таксама так званыя «байкі жыцця», адметныя тым, што на першы план у іх выходзіць філасофска-алегарычны пасыл: «Сцяна» (1995), «Музыка», «Народныя мсціўцы» (1997), «Мальбара», «Тры нявымаўленых словы», «Труба» (1998), «Галоўны крыгсман», «Хутаранцы», «Апалагетыка “нагана”», «Кошка і мышка» (1999). Публіцыстыка і эсэістыка, аўтабіяграфічныя нарысы, раней ненадрукаваныя апавяданні і лісты з перапіскі з Р. Барадуліным – усё гэта склала багатую спадчыну нашага выдатнейшага мастака, увасобленага сумлення нацыі.

Апошнім часам філасофскае асэнсаванне сучаснага стану чалавека, грамадства, навакольнага асяроддзя і ўздзеяння інфармацыйных тэхналогій вылілася ў раздзел гуманітарыстыкі, які мае шырокую назву «постгуманізм». Калі адны з напрамкаў гэтых даследаванняў засяроджваюцца на не звязаным з чалавечай існасцю – свет раслінаў і жывёл, нежывая прырода, касмічныя з’явы, тэхналогіі і робаты, – то іншыя, наадварот, надаюць увагу феномену так званага «новага чалавека», што існуе ў эпоху «пост» – постмадэрнізму, пострэалізму, посткаланіялізму і г.д. Гэтыя апошнія ўзгаданыя напрамкі аб’ядноўваюць сур’ёзныя філасофскія развагі аб надыходзе новых часоў, новага тыпу мыслення і аб пераменах, якія адбываюцца ў свеце. Такім чынам, новыя гуманістычныя разважанні ставяць пытанні аб вартаснасці асобы ці грамадства, аб межах індывідуальнага і асобаснага, аб канфлікце розных асобасных установак.

Такія ж пытанні хвалявалі і В. Быкава, што асабліва відавочна ў шэрагу апошніх яго «казак жыцця». Два творы, маючы кардынальна розную праблематыку і стылёвыя рысы, нават розныя жанравыя формы, даюць рознабаковую карціну гуманістычных светапоглядаў пісьменніка: «Бедныя людзі» і «Сьцяна».

Першы аповед – «Бедныя людзі» – прасякнуты двума матывамі: цяжкасць маральнага выбару і адвечная «гамлетаўская» няўпэўненасць у асабістай правамочнасці дзейнічаць з нейкай мэтай, для дасягнення якой і патрэбны гэты самы пакутны выбар. Сюжэт аповеда даволі традыцыйны: прафесара Скварыша, якога выключылі з КПСС за погляды, адкрыта выказаныя ім і не адпавядаючыя курсу партыі, а таксама пазбавілі магчымасці займацца любімай працай, наведвае яго аспірант, каб выказаць спачуванне і

спагаду. Аднак у час, апісаны ў аповедзе, калі ўжо няма пачвары сталінізму, але няма і сапраўднай дэмакратыі і гуманізму, няма і не можа быць упэўненасці ў шчырасці ці праўдзівасці людзей, нават блізкіх і сяброў. Такім чынам, перад героем паўстае дылема: уратаваць сябе ад верагоднага знішчэння кар'еры, тытулаў, сяброўства, спакойнага жыцця і нават магчымасці займацца любімай працай – з аднаго боку, а з другога – пазбавіць усяго таго ж іншага чалавека. Сітуацыя замешана на поўнай немагчымасці вызначыць праўду фактаў. У выніку прафесар усё ж ідзе да будынку КДБ і «здае» свайго аспіранта, запісаўшы ўсе яго словы спагады на паперу.

«Бедныя людзі» – знакавы загаловак. Ён аб'ядноўвае і «праследавацеля» і «ахвяру», і страх і сумленне, і праўду і прытворства. Аўтар будуе тэкст на чаргаванні «за» і «супраць», што на працягу ўсёй ночы прымушаюць свядомасць і сумленне Скварыша пакутаваць. Гуманістычнае пасланне твора можна класіфікаваць, згодна даследаванню У. А. Сміта, як натуралістычны гуманізм. Гэта значыць, што праз «Бедных людзей» прачытваецца ідэя неабходнасці нейкага эклектычнага набору ўстановак, што сканцэнтраваныя на веры ў найвышэйшую каштоўнасць і самаўдасканаленне чалавечай асобы. Няхай сабе такая вера падаецца *ex contrario*, аднак праз твор адчуваецца глыбокая чалавечая спагада, рэдкая эмпатыя і разуменне хісткасці, няўстойлівасці, няцвёрдасці і натуральнай слабасці псіхікі чалавека. Здаецца, В. Быкаў і не патрабуе ад свайго героя «гераізму», дэманструючы абсалютную залежнасць паводзін і напрамку мыслення ад рэжыму, абставін, акалічнасцей для выжывання. У нейкай ступені можна сказаць, што гуманістычны падтэкст адлюстроўвае і нарматыўны гуманізм – прызнанне таго, што ў чалавека ёсць спецыфічныя чалавечыя патрэбы, якія неабходна забяспечваць. І не чалавек павінен прыстасоўвацца да грамадства, а грамадства павінна быць пабудавана дзеля задавальнення чалавечых патрэбаў. Да гэтай думкі падштурхоўвае эпічны вобраз будынку КДБ, які ўвасабляе сістэму, варожую і бездухоўную, цалкам абыякавую да чалавека, дбаючую выключна аб палітычнай ідэі.

Стома, боль, страх, пакута – усе гэтыя эмоцыі апісаны В. Быкавым у чалавеку, які не злачынца і не нягоднік, аднак робіць учынак, да якога цяжка адносіцца са спачуваннем.

У аповедзе «Сьцяна» паўстае іншы вобраз, які нагадвае блуканні і высілкі герояў Ф. Кафкі, твор таксама сугучны «Запрашэнню на смяротнае пакаранне» У. Набокава. У галоўнага героя няма імя – толькі займеннік *ён*, нейкі неазначаны невядомы мужчына, што адбывае пакаранне ў турме і, відавочна, наўрад ці разлічвае на «вызваленне». Знайшоўшы слабае месца ў сваёй камеры, у муры, ён аддана і ўпарта, з надзеяй і вялізнымі высілкамі голымі рукамі выдзяўбае, выкалупвае сабе праход на «волю», якая ў рэшце рэшт аказваецца падворкам усё той жа самай турмы. Экзістэнцыяльны матыў бессэнсоўнасці сізіфавай працы, беспрасветнасці існавання ў дыктатуры – так В. Быкаў вызначае хранатоп твора – рэалізуецца ўсяго ў некалькіх вобразах і дробных мастацкіх дэталях: камера, сцяна, транты, параша і

вартаўнікі… Клаўстрафобія і напружанасць атмасферы апавядання, сфакусаванасць на адным дзеянні, якое іранічна заканчваецца паражэннем, няўдачай, стылёвы, жанравы і сюжэтны мінімалізм ствараюць у сукупнасці моцны «ядзерны» эфект.

У аснове канфлікта – толькі дарэмнае змаганне жывой істоты з нежывой матэрыяй, якая, тым не менш, метафарычна вызначае сістэму, дыктатуру, бяспраўе і гаротную долю чалавека. Аднак гэты мінімалізм і супрацьпастаўленне чалавека і сцяны хаваюць тонкі гуманістычны падтэкст, які прачытваецца нават у саміх «дзеючых асобах» апавядання. З аднаго боку, жанравыя і стылёвыя асаблівасці набліжаюць твор да сартраўскай алегарычнай прытчы, тым самым надаючы тэксту рысы атэістычнага гуманізму, паводле ўжо ўзгаданай класіфікацыі У. А. Сміта. Аднак багаты шэраг прыметнікаў і прыслоўяў, якія вызначаюць якасці сцяны і месца зняволення, надае тэксту таксама свой асабісты псіхалагізм, які ў нейкай ступені абыякавы да цэнральнай філасофскай думкі і скіраваны на вывучэнне эмацыйнай сферы чалавечай свядомасці. Так, гэтая сцяна *халодная, закапцелая, глухая, зацвярдзелая.* Насуперак гэтай непарушнай статыцы (якую, на здзіўленне, надзея на жыццё і прага волі змаглі пераадолець) выступае такое ўразлівае і слабое чалавечае цела, зламаная псіхіка, адзінокая і бездапаможная воля. Менавіта праз такі кантраст нараджаецца алегарычны гуманізм. Аўтар не задаецца пытаннем наконт таго, ці сапраўды вінаваты гэты чалавек, ці здзейсніў ён якое-небудзь злачынства, акрамя ўдзелу ў забароненых рэжымам палітычных рухах. Галоўнае – гэта чалавек супраць сістэмы, дыктатуры, «сцяны». Паражэнне ў гэтай маўклівай барацьбе можна тлумачыць двояка: як экзістэнцыяльную бессэнсоўнасць такога супрацьстаяння, з аднаго боку, а з другога – як права, моц і вартасць чалавечага жыцця, нават калі яно абрываецца на турэмным падворку.

У выніку можна падагуліць аналіз двух алегарычных аповедаў В. Быкава сцвярджэннем наяўнасці некалькіх плыняў гуманізму XX ст.: натуралістычнага, нарматыўнага, атэістычнага і самабытнага – алегарычнага.

**Ю. У. Раманчук**

## ЭНАНТЫЁСЕМІЯ ЯК САМАСТОЙНАЯ ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНАЯ КАТЭГОРЫЯ

Кожнаму прадмету або з'яве матэрыяльнага свету ўласцівы ўнутраныя супрацьлегласці. Гэтыя супрацьлегласці знаходзяцца ў пэўнай цэласнасці і ўзаемадзеянні, але пры гэтым вядуць паміж сабой барацьбу і ўзаемна выключаюць адзін аднаго. Так, у фізіцы – гэта атамы са станоўча і адмоўна зараджанымі часціцамі, у медыцыне – абмен рэчываў як адзінства працэсаў асіміляцыі і дысіміляцыя, у неўралогіі – дзейнасць нервовай сістэмы як адзінства працэсаў ўзбуджэння і тармажэння, у грамадскім жыцці – эксплуатацыя і сатворчасць, у сістэме мовы – энантыёсемія.